УДК 821.111/.161.3-312.4

Вуч. А.С. Несцярэня
Навук. кір. І.Р. Казачэнка, настаўнік беларуская мовы і літаратуры
(ДУА "Лельчыцкая раённая гімназія")

# РАЗГАДКА ТАЯМНІЦ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ А. КОНАН-ДОЙЛА "САБАКА БАСКЕРВІЛЯЎ" І У. КАРАТКЕВІЧА "ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА")

Дэтэктыў (англ. – шпік; от лат. – раскрыццё) – мастацкі твор з асаблівым тыпам сюжэта, звязаным з раскрыццём загадкавых злачынстваў, супрацьстаяннем дабра і зла, дзе, як правіла, дабро перамагае зло. Для дэтэктыва як жанра характэрны наступныя асноўныя прыметы:

1) наяўнасць таямніцы злачынства (часцей забойства); 2) маральнае і фізічнае сутыкненне на гэтай падставе шпіка-прафесіянала ці шпіка-аматара і злачынцы; 3) працэс расследавання, пры якім правяраюцца і адпрацоўваюцца розныя версіі, выпрабаванню належаць розныя падазраваныя; 4) устанаўленне асобы злачынцы; 5) узнаўленне ўсіх акалічнасцей злачынства.

Істотнай асаблівасцю дэтэктыва з'яўляецца тое, што абставіны здарэння не паведамляюцца чытачу да заканчэння расследавання. Замест гэтага аўтар вядзе чытача праз увесь працэс расследавання, даючы яму магчымасць на кожным этапе будаваць уласныя версіі і ацэньваць вядомыя факты.

Аповесць «Сабака Баскервіляў» стала адной з самых вядомых гісторый пра Шэрлака Холмса.

Прааналізуем сюжэт аповесці з пункту гледжання жанравых асаблівасцей.

*Наяўнасць таямніцы*. Сюжэтная лінія аповесці разгортваецца ў старажытным маёнтку сям'і Баскервіляў, глава якой памірае ад сардэчнага прыступу, справакаванага з'яўленнем страшнай істоты ў выглядзе сабакі, якая, праследуе сям'ю на працягу некалькіх стагоддзяў.

*Сюжэтная лінія аповесці*. У мястэчку Грымпэн адбываецца нешта таямнічае. Джэймс Марцімэр, мясцовы доктар, просіць Шэрлака Холмса расследаваць таямніцу смерці Чарльза Баскервіля, гаспадара Баскервіль-хола. У гэтай сям'і існавала легенда пра сабаку-пачвару, якая з'яўляецца праклёнам роду Баскервіляў.

У родавы маёнтак прыязджае нашчадак сэр Генры Баскервіль. Ён атрымлівае ананімнае пісьмо-папярэджанне пра тое, што яму трэба

трымацца найдалей ад балота (а іменна там знаходзіцца спадчынны маёнтак сям'і). Шэрлак Холмс адпраўляе маладога нашчадка ў суправаджэнні свайго кампаньёна Ватсана ў маёнтак. Заданне Ватсана – паведамляць шпіку пра ўсё, што будзе адбывацца ў доме і ў яго наваколлі.

*Маральнае і фізічнае сутыкненне на гэтай падставе шпіка-прафесіянала і злачынцы*. Наперадзе ў Шэрлака Холмса нялёгкае расследаванне з мноствам вострых паваротаў і цікавых адкрыццяў. Разблытванне гэтай справы зойме многа часу і сіл. Асаблівасцю аповесці з'яўляецца наяўнасць у творы годнага шпіку-прафесіяналу праціўніка ў вобразе містара Стэплтана, які валодае выдатным розумам, умее прадставіць абставіны на сваю карысць, назіральнага і рашучага чалавека.

*Працэс расследавання*, пры якім правяраюцца і адпрацоўваюцца розныя версіі, выпрабаванню належаць розныя падазраваныя. Пасля смерці сэра Чарльза Баскервіля прыязджае нашчадак маёнтка. Прыватны дэтэктыў заўважае, што за маладым чалавекам сочаць. Пакуль сэр Генры знаходзіцца пад наглядам доктара Ватсана, Холмс гутарыць са сведкамі, устанаўлівае лагічныя сувязі паміж падзеямі і асобамі.

| ***тыповыя персанажы аповесці "Сабака Баскервіляў"*** | | | |
|---|---|---|---|
| Злачынца | Пацярпелы | Сведка | Падазраваны |
| Стэплтан | Генры Баскервіль | доктар Марцімэр, Лора Лайанс | Сэлдан, Бэрымор |
| ***кампаньён прыватнага дэтэктыва*** | | | |
| доктар Ватсан | | | |

Прааналізуем сюжэт аповесці У. Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" з пункту гледжання жанравых асаблівасцей твора дэтэктыўнага жанру.

*Наяўнасць таямніцы*. Сюжэтная лінія аповесці разгортваецца ў старажытным маёнтку сям'і Яноўскіх, глава якой памірае, загнаны ў дрыгву вершнікамі-зданямі на дрыкгантах, якія, праследуюць сям'ю на працягу некалькіх стагоддзяў.

*Сюжэтная лінія аповесці*. Малады вучоны-фалькларыст Андрэй Беларэцкі прыехаў у глухі павет адной з беларускіх губерняў. Ён трапляе ў маёнтак Балотныя Яліны. Уладальніцай маёнтка з'яўляецца апошняя прадстаўніца калісьці магутнага роду Надзея Яноўская. Па начах у доме бачаць Малога Чалавека і Блакітную Жанчыну, прадвеснікаў смерці кагосьці з роду Яноўскіх. Страх на ўсё наваколле наганяе дзікае паляванне караля Стаха, падчас якога (два гады назад)

быў забіты бацька Надзеі. Яно ж пагражае смерцю дачцэ. Беларэцкі вырашыў раскрыць таямніцу гэтых з’яў і дапамагчы ўладальніцы Балотных Ялін. З бібліятэчнай кнігі герой твора даведваецца пра караля Стаха і радавое пракляцце Яноўскіх. Гэта пракляцце праз стагоддзі пагражае гаспадыні маёнтка Надзеі.

*Маральнае і фізічнае сутыкненне на гэтай падставе шпіка-прафесіянала і злачынцы.* Андрэю Беларэцкаму ўдалося выкрыць таямнічыя сілы і разам з сялянамі атрымаць перамогу над прафесійнай бандай. Як і ў А. Конан Дойла, асаблівасцю аповесці з’яўляецца наяўнасць у творы праціўніка шпіку-аматару ў вобразе Дубатоўка, які валодае выдатным розумам, рашучы і бязлітасны, умее прадставіць абставіны на сваю карысць.

*Працэс расследавання, пры якім правяраюцца і адпрацоўваюцца розныя версіі, выпрабаванню належаць розныя падазраваныя.* Пасля смерці бацькі Надзеі Яноўскай яна становіцца нашчадкам маёнтка. Дэтэктыў (якім вымушана становіцца Андрэй Беларэцкі) заўважае, што маладую дзяўчыну палохаюць: у маёнтку паяўляюцца здані (Малы Чалавек, Блакітная Жанчына), за сценамі маёнтка час ад часу скача дзікае паляванне. У поле зроку Беларэцкага пападаюць Берман-Гацэвіч, ахмістрыня Закрэўская. Яны ўважліва вывучалі старажытныя дакументы роду Яноўскіх, шукалі пацверджанне сваяцтва з імі.

| ***Тыповыя персанажы аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”*** | | | |
|---|---|---|---|
| Злачынца | Пацярпелы | Сведка | Падазраваны |
| Дубатоўк | Надзея Яноўская | Рыгор, Андрэй Свеціловіч | Берман-Гацэвіч, Алесь Варона |
| ***Кампаньён дэтэктыва-аматара*** | | | |
| паляўнічы Рыгор | | | |

Як бачым, у аповесці У. Караткевіча расследаванне вядзе непрафесіянал, чалавек, які не валодае ніякімі выключнымі здольнасцямі. Ён проста назіральны, прагне ўсталявання справядлівасці. Дапамагае яму кампаньён, селянін-паляўнічы, які быў сведкам многіх падзей аповесці, назіральны, чэсны, бескампрамісны, гатовы ісці да канца і не шкадаваць злачынцаў, актыўна ўдзельнічае ў ходзе расследавання.

Прааналізаваўшы дэтэктыўную аповесць У. Караткевіча, мы зрабілі наступныя вывады:

Галоўны герой твора вядзе расследаванне. Толькі ў А. Конан Дойла гэта шпік-прафесіянал, а ў Караткевіча расследаваннем вымушаны займацца галоўны герой аповесці.

У аповесцях англійскага і беларускага пісьменнікаў ёсць падобнае і адметнае. Іх героі – дапытлівыя, справядлівыя, здольныя

аддзяліць містыку ад рэальных фактаў. Абодва яны даследуюць злачынствы і знаходзяць злачынцу. Адметнае ў асаблівасцях вобразаў: герой Конан Дойла – прафесійны шпік, герой Караткевіча стаў расследаваць злачынства воляй абставін, у якіх апынуўся.

## ЛІТАРАТУРА


1. Дойл, А. Из записок о Шерлоке Холмсе. Собака Баскервилей – Москва: Искона, 1993, – 416 с.
2. Караткевіч, У. С. Дзікае паляванне караля Стаха: аповесць / Уладзімір Караткевіч, – Мінск: Маст. літ., 2008 – 493 с.


УДК 821.161.3:165.9

Навуч. У.Р. Рагозік
Навук. кір. Г.І. Кібалка, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА "Сярэдняя школа імя Я. Купалы № 19 г. Мінска")

## ПРЫМЯНЕННЕ РЫС ЖЫВЁЛ ДЛЯ АПІСАННЯ ХАРАКТАРУ ЧАЛАВЕКА

У дадзенай рабоце сабраны матэрыял, які паказвае, як з дапамогай рыс жывёл, можна даць характарыстыку чалавеку. Прааналізаваны вобразы жывёл як носьбітаў чалавечых якасцей у некаторых творах мастацкай літаратуры, фалькоры і ў жыцці. Разгледжаны шляхі пераносу ўласцівых жывёлам рыс на чалавека. Вызначана суаднесенасць станоўчых і адмоўных рыс характару людзей, якія раскрываюцца праз вобразы жывёл і птушак. А таксама зроблена супастаўленне разгледжанага матэрыялу з аналагічным у рускай мове.

Аб'ект даследавання: характар і яго рысы.

Прадмет даследавання: методыка апісання характару чалавека з прымяненнем рыс жывёл.

Мэта даследавання: паказаць магчымасць прымянення рыс жывёл для апісання характару чалавека.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

– даць тэарэтычны навуковы і літаратурны агляд паняццю характару і яго рысам;

– разгледзіць вобразы жывёл, якія з'яўляюцца носьбітамі чалавечых якасцей;

– прааналізаваць творы мастацкай літаратуры, прыказкі, фразеалагізмы, у якіх даецца характарыстыка чалавека праз вобразы жывёл;

– вызначыць шляхі пераносу ўласцівасцей жывёл на чалавека.